# Праблема экзістэнцыяльнага выбару ў сучаснай філасофіі і культуры (тэарэтыка-метадалагічныя аспекты аналізу)*

**Н. С. Клішэвіч,**
аспірант РІВШ

*Актуальнасць тэмы экзістэнцыяльнага выбару ў беларускай філасофіі і культуры вынікае перш за ўсё з разгляду сучаснага стану беларускай культуралагічнай і філасофскай думкі. Гэта абумоўлена тым, што ў нашым грамадстве сёння аднаўляецца перарваная раней антрапалагічная традыцыя філасофскага мыслення, што, безумоўна, ідзе поруч з працэсам разгортвання такіх самых праблем ў свеце.*

Звяртанне да праблемы чалавека для айчыннай навукі набывае новы сэнс, паколькі прадметам аналізу становіцца не толькі соцыум і сацыяльныя сувязі суб'екта, як гэта было ў савецкай навуцы, і не толькі асобаснае быццё, як гэта было ў заходняй традыцыі, але і пытанні, якія датычацца ўзаемнага ўплыву быцця асобы і быцця грамадства ва ўзаемасувязі іх супярэчнасцяў. Такі зрух акцэнтаў адлюстроўвае агульную для сучасных сацыяльна-гуманітарных ведаў тэндэнцыю выхаду антрапалагічнай праблематыкі за межы выключна філасофскага асэнсавання. Чалавек як шматмерная істота ў працэсе свайго станаўлення адчувае шматлікія як ўнураныя ўплывы, так і звонку, пры гэтым засваенне пэўнай інфармацыі адбываецца апасродкавана праз сістэму нормаў, прынятых у межах той культуры, у якой знаходзіцца чалавек.

Калі разважаць у штодзённым, жыццёва-практычным сэнсе, то *«прастора выбару»* і ёсць наша паўсядзённае быццё. Яно складаецца з мноства амаль пахвілінных *«выбараў»*: думак, меркаванняў, канстатацый, мэтаў, рашэнняў і дзеянняў. Праўда, выбіраем мы падчас бяздумна, аўтаматычна, робячы спасылкі на сітуацыю, якая ад нас не залежыць, і тым самым *«адмаўляемся»* для сябе, грэбуем каштоўнасцю асабістага Я і добраахвотна ахвяруем сваёй свабодай. У выніку падобных самаадмаўленняў мы ў рэшце рэшт трапляем у стан перманентнай трывогі, тугі, раздражнёнасці, незадаволенасці сабой і жыццём. Літаратура дае нам шмат прыкладаў падобных парогавых станаў: ад душэўных пакут Радзівона Раскольнікава да экзістэнцыяльнай ташнаты сартраўскага Антуана Ракантэна.

У грамадска-гістарычным плане «прасторай выбару» з'яўляецца соцыум у любой яго форме: народ, этнас, дзяржава і інш. У суадносінах з гэтым відавочны і суб'ект выбару – чалавек, але наўрад ці гэта будзе *«чалавек натоўпу»*: вынік яго выбару ў гістарычным і культурным плане неістотны. Размова можа ісці пра чалавека (альбо, напрыклад у мастацкім творы, пра *«тыповы характар»* у пэўны гісторыка-культурны перыяд), які здольны ўплываць на ход грамадскіх працэсаў.

Упершыню аб праблеме свабоды выбару гаворыць Арыстоцель, які вырашае яе праз суадносіны з мараллю. У далейшым праблема свабоды як магчымасці выбару праглядваецца ў філасофіі гісторыі Гегеля, антрапалогіі Канта і ў філасофскім пошуку экзістэнцыялістаў XX ст. У цэнтры ўвагі экзістэнцыялістаў пытанні рашэння і выбару, віны і адказнасці, вызначэння свайго месца ў свеце, валодання свабодай. Менавіта з гэтымі пытаннямі звязана іх цікавасць да маралі, літаратуры і мастацтва. Для многіх французскіх экзістэнцыялістаў характэрна літаратурна-мастацкая дзейнасць, такім

* Прадстаўлена навуковым кіраўніком **Я. С. Яскевіч**, доктарам філасофскіх навук, прафесарам

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 29.06.2009 г.

чынам, філасофія выкладаецца імі ў драматычных творах, навэлах, раманах, мемуарах.

Філасофскую антрапалогію ў літаратуры з пункту гледжання маральнага выбару даследаваў М. М. Бахцін, які лічыў, што пакуль чалавек жыве, ён жыве яшчэ тым, што ён не завершаны і не сказаў апошняга слова.

Выбар – вырашэнне нявызначанасці на пэўных узроўнях чалавечай дзейнасці ва ўмовах множнасці альтэрнатыў [8, с. 81].

Гістарычна праблематыка выбару распрацоўвалася першапачаткова ў кантэксце праблемы свабоды волі. Усе спрэчкі зводзіліся да таго, ці можа чалавек здзяйсняць свабодны (не дэтэрмініраваны звонку) выбар ці ён прадвызначаны Боскім Правідзеннем, лёсам, сукупнасцю натуральных законаў.

У сучаснай культуры і этыцы праблема выбару даследуецца ў кантэксце вырашэння маральных канфліктаў, барацьбы матываў дабра і зла. Таму прадметам разгляду з'яўляецца ўсвядомлены выбар пры ясным разуменні альтэрнатыў.

У псіхалогіі праблема выбару актыўна вывучалася ў кантэксце прыняцця рашэнняў як адна з фаз складанага кагнітыўнага працэсу.

У псіхалогіі асобы выбар – асобасная гатоўнасць прыняцця на сябе адказнасці за яго вынікі. Здольнасць і магчымасць несці цяжар выбару уласцівы сталай, развітай, аўтаномнай асобе. Найбольш распрацаваная тэорыя асобаснага выбару Н. Ф. Наумавай. Псіхолаг Д. А. Лявонцьеў выдзяляе некалькі ўзроўняў выбару: 1) *просты* – калі зададзены як альтэрнатывы, так і крытэрыі для іх параўнання; 2) *сэнсавы* – калі неабходна самастойна пастроіць сістэму крытэрыяў, параўнаць і вызначыць сэнс кожнай; 3) *асобасны*, ці *экзістэнцыяльны* – калі не толькі крытэрыі перавагі, але і альтэрнатывы не зададзеныя, а павінны будавацца самім суб'ектам. Такім чынам, экзістэнцыяльны выбар – акт дзейнасці, пры якім чалавек (асоба), праяўляючы сваю аўтаномію, самавызначаецца ў адносінах сістэмы каштоўнасцяў, ідэалаў, прынцыпаў і спосабаў іх рэалізацыі ў лініі паводзін ці ў асобных учынках.

Калі экзістэнцыяльную антрапалогію разглядаць як прадметна-катэгарыяльную сферу, то можна ўбачыць, што такая катэгорыя, як выбар разглядаецца ў пэўнай звязцы: *«выбар – свабода – адказнасць»*. У сістэме экзістэнцыяльных катэгорый свабода і адказнасць даўно набылі тэарэтычны статус. У пачатку 60-х – першай палове 70-х гг. XX ст. навукоўцамі разглядаліся асноўныя палажэнні класікаў марксізму аб дыялектыцы свабоды і адказнасці, канкрэтызавалася разуменне гэтых палажэнняў. У 80-я гг. XX ст. з'явіліся манаграфіі Н. А. Мінкінай, В. І. Сперанскага [7, с. 7], у якіх працягваўся разгляд самых разнастайных аспектаў тэорыі адказнасці і свабоды.

На працягу доўгага часу праблема экзістэнцыяльнага (маральнага) выбару з'яўляецца прыярытэтнай у філасофска-культуралагічнай навуцы і разглядаецца пераважна з двух бакоў:

1. Чалавек можа адвольна выбіраць толькі ўчынкі як сродак дасягнення спрадвечна зададзенай вышэйшай мэты (Арыстоцель, Локк).

2. Уласна маральны сэнс мае толькі выбар вышэйшай мэты, г. зн. самой маралі (Кант, Гегель). Аднак такое тлумачэнне маральнага выбару мае сэнс толькі ў вырашэнні філасофскага пытання аб сутнасці маралі. Практычна такі маральны выбар выражаецца ва ўсведамленні чалавекам сваёй жыццёвай пазіцыі.

Свабода маральнага выбару праяўляецца ў тым, што чалавек не проста выбірае мараль і тым самым сведчыць пра наяўнасць свядомасці, але і дзейнічае ў канкрэтных абставінах згодна з гэтым выбарам: выбіраючы дабро, вызначаецца ў адносінах зла. Экзістэнцыяльны выбар, такім чынам, ставіць чалавека ў крытычныя адносіны да супярэчлівай сацыяльнай рэчаіснасці, якая фіксуецца калізіяй і суправаджаецца неадназначнай канфліктнай сітуацыяй. Толькі пераходзячы ў канфлікт, калізія выступае як спосаб засваення быцця, калі чалавеку патрэбна здзейсніць выбар паміж маральнымі каштоўнасцямі, якія сутыкаюцца, на карысць адной з іх. А вырашэнне маральнага канфлікту арганічна звязана з учынкам як каталізатарам сітуацыі, *«чалавек павінен дзейнічаць у сітуацыі, але як, яна яму не ўказвае, і ў гэтым складаецца яго свабода»* [5, с. 416], свабода волі.

Свабода волі – здольнасць чалавека самастойна ў адпаведнасці са сваім светапоглядам вызначаць свае ўчынкі, дзейнічаць на падставе асабістага рашэння. Калі сітуацыя і ёсць прымус да рашэння, то свабода складаецца з самога рашэння, што мае на ўвазе аналіз *«парогавай сітуацыі »* (К. Ясперс, Ж.-П. Сартр, А. Камю), стрэсавай, параўнанне магчымых варыянтаў паводзін, ацэнку наступстваў выбару. У гэтай парогавай сітуацыі чалавек уяўна перагле-джвае пройдзены шлях, быццам па-новаму накідвае чарнавік лёсу, у чымсьці ўпэўніваючыся, штосьці адхіляючы. І чалавеку даводзіцца шукаць у самім сабе і знаходзіць сілы супрацьстаяць абставінам, што залежыць ад яго задаткаў: розуму, інтуіцыі, інстынкту і г. д., і менавіта гэта выклікае адказнасць за свае дзеянні.

Адказнасць можна разглядаць як суаднесенасць маральнай дзейнасці чалавека да яго абавязку. Адказнасць уключае наступныя пытанні: ці здольны чалавек выконваць патрабаванні, якія яму прадпісаныя, ці павінен ён адказваць за вынікі сваіх дзеянняў і ці можа ён прадбачыць гэтыя вынікі. Дадзеная мера адказнасці кожнага залежыць ад гістарычна дасягнутага ўзроўню развіцця чалавечага грамадства. Такім чынам, праблема адказнасці – гэта пытанне пра ма-

ральную свабоду чалавека, якая залежыць ад свабоды іншых і разглядаецца ў кантэксце пэўнай эпохі.

Выбар – катэгорыя найменш тэарэтызаваная, але не менш актуальная, бо шырока прадстаўлена ў мастацкіх творах сусветнай і айчыннай літаратуры. Марксісцкая антрапалогія абмяжоўвалася вывучэннем сутнасці і прыроды чалавека і наогул не цікавілася экзістэнцыяльным аспектам. Адсюль пэўныя цяжкасці, што ўзнікаюць пры аналізе сітуацый выбару і праблем сэнсу жыцця, якія характарызуюць існаванне індывіда ў пэўным сацыяльна-гістарычным кантэксце.

Звычаі першабытна-радавога грамадства таксама ўскосна раскрывалі праблему выбару. *«Существует в первобытности и проблема выбора, причем отклонения от принятых норм всегда оценивались неоднозначно. Мифы очень часто рассказывают о героях, которые не делают того, что делают все, не ходят или ходят туда, куда нужно идти, не слушают того, кого они должны слушаться, и, тем не менее, представляют социально-положительное начало»* [4, с. 31].

У перыяд антычнасці чалавек успрымае сваё сацыяльнае акружэнне ў яго цэласнасці, калектыўнасці. Напрыклад, інстытут астракізму – пэўны сімвал улады абшчыны над асобным чалавекам і адсутнасць правоў апошняга супраць умяшання ў асабістае жыццё. Паказальны ў гэтым плане прысуд, вынесены Сакрату. Знаходзячыся ў парогавай сітуацыі, перад смерцю, Сакрат разважаў не пра асабістую свабоду, а пра глабальную праблему, пра тое, што кіруе чалавечымі паводзінамі: не ўстройства цела, а *«мнение о лучшем»*, г. зн. маральнасць, меркаванне, якое вымагае прыняць тое, што прызначыла дзяржава. Смерць Сакрата – гэта фатальнае пытанне *«А ці трэба жыць?»*, калі праўда законна забіта [7, с. 184]. Сваім выбарам Сакрат разлічваў паднесці маральны ўрок усім людзям з тым, каб коштам жыцця даказаць правату і выратаваць асабістае Я. *«Пазнай самога сябе»* – гэты тэзіс ператварае праблему чалавека ў асноўную праблему філасофіі. Аргументацыя Сакрата пры ўсёй складанасці зыходзіць з меркавання, што перш чым штосьці вырашыць, трэба спачатку выбраць, паколькі правільны выбар вядзе да дабрабыту. Менавіта Сакрат стаў першым выкарыстоўваць паняцце *«airesis»* – выбар [6, с. 357]. Аднак ён ніколі не даваў азначэнне чалавека. Каментуючы гэты факт, Э. Касірэр піша, што фізічныя рэчы можна апісаць ў тэрмінах іх аб'ектыўных уласцівасцяў, а чалавека – толькі ў тэрмінах яго свядомасці [3, с. 7–8]. Такім чынам, Сакрат, першы *«распяты на крыжы за праўду»* з роду чалавечага, пацвердзіў сваім выбарам, што чалавек – мера ўсіх рэчаў, і над ім няма ніякага вышэйшага пачатку, акрамя яго свядомасці.

Арыстоцель звязвае маральны выбар з дзейнасцю, якая стасуецца са свабодай волі, чалавек выбірае сябе, як маральную свядомую істоту, г. зн. асобу, якая суадносіць свае паводзіны і стыль жыцця з маральным ідэалам, з уяўленнямі і паняццямі пра дабро і зло. Чалавек у Арыстоцеля валодае свабодай волі і аднолькава ўладны ў выбары дабра і зла, дабрадзейнасці і парока, адсюль вынікае, што чалавек адказны за свае дзеянні.

Праблемы індывідуальнай свабоды, адказнасці і экзістэнцыяльнага выбару мелі асабліва востры характар для сусветнай культуры і літаратуры ў ХХ ст. Гэта заканамерна, бо вайна і сацыяльныя рэвалюцыі, жыццё, пастаўленае пад пагрозу татальнага знішчэння, вымушалі чалавека актывізавацца, заявіць пра сябе. Экзістэнцыялізм прыцягнуў увагу да сэнсава-жыццёвых пытанняў: віны і адказнасці, рашэння і выбару, адносін чалавека да свайго прадвызначэння і смерці. З найбольшай сілай гэтыя праблемы (свабоды, адказнасці і экзістэнцыяльнага выбару) абмяркоўваюцца ў творах пісьменнікаў-экзістэнцыялістаў К. Ясперса, А. Камю, Ж.-П. Сартра, В. Быкава.

Пра экзістэнцыяльны выбар можна гаварыць як у дачыненні да выбару ўчынкаў, так і да выбару каштоўнасцяў. Першае – гэта выбар формаў паводзін, якія рэалізуюць прынятыя чалавекам маральныя каштоўнасці, другое – выбар саміх каштоўнасцяў. Маральныя нормы і правілы фарміруюцца, узнікаючы са шматгадовай жыццёвай практыкі паводзін людзей, і становяцца ўзорам толькі ў тым выпадку, калі грамадства інтуітыўна ўсведамляе карысць іх агульнай еднасці. Такім чынам, мараль можна лічыць праяўленнем калектыўнай волі людзей, якая праз сістэму патрабаванняў, ацэнак і правілаў узгадняе інтарэсы людзей з інтарэсамі грамадства. Нягледзячы на гэта ў сітуацыі экзістэнцыяльнага выбару да чалавека прыходзіць разуменне таго, што правілы ствараюцца не толькі знешняй неабходнасцю, але і часткова ім самім, яны – вынік праяўлення яго індывідуальнай волі, яго свядомага выбару. Канешне, выбар альтэрнатыў абмежаваны, паколькі маральнае засваенне індывідам рэчаіснасці мяркуе падзел усіх сацыяльных з'яў на *«дабро»* і *«зло»*.

Асоба, якая глыбока пакутуе, якая жадае выпрастацца, але жыццё яе штурхае да самаразбурэння, – гэтыя рысы праяўляюцца ва ўсёй беларускай вясковай прозе. Іншая сітуацыя назіраецца ў *«лейтэнанцкай прозе»*, дзе праблемы свабоды і чалавека на пэўны час збліжаюцца: менавіта на вайне, застаючыся адзін на адзін з ворагам, чалавек быў свабодны выбіраць, што прасочваецца ў беларускай прозе К. Чорнага, І. Мележа, Я. Брыля, А. Кулакоўскага, М. Лупсякова, В. Быкава. Але і ў гады вайны, і пасля яе шмат пісалася павярхоўных, недастаткова праўдзівых твораў. У беларускай літаратуры, на

мой погляд, найбольш удала звязка *«выбар – свабода – адказнасць»* праяўляецца ў творчасці народнага пісьменніка Беларусі В. Быкава. У сваіх творах ён разглядае праблемы жыццядзейнасці і светапогляду чалавека ў грамадстве праз катэгорыю выбару. У першай яго аповесці *«Жураўліны крык»* катэгорыя выбару пакуль не носіць экзістэнцыяльнага характару, скіравана больш у бок сацыяльнай адказнасці за лёс радзімы, салдацкага абавязку. У больш позніх творах маральныя моманты выбару, якія скіраваны перш за ўсё на вызначэнне чалавекам сваёй сутнасці, унутранага Я, займуць дамінуючае месца.

*«Чалавек,* – гаварыў пісьменнік у адным з інтэрв'ю, – *прайшоўшы ў сваім развіцці вялізны шлях ад звера да свядомай істоты, змяшчае ў сваёй душы дужа шмат рознага. Але справа ў тым, што ў розных сацыяльна-палітычных умовах праяўляюцца яе пэўныя якасці... Фашызм для дасягнення сваіх драпежных мэт адкрыў у чалавеку дарогу яго самым чорным інстынктам... Гітлер усю адказнасць браў на сябе. Выходзіць, вельмі лёгка рабіць злачынствы, калі адказваць за іх будзе нехта іншы»* [1, с. 115].

У шэрагу сваіх аповесцяў – «*Пастка*», *«Мёртвым не баліць»*, *«Пайсці і не вярнуцца»*, *«Знак бяды»* і інш. – В. Быкаў паказаў, што фашызму патрэбны *«маленькія людзі»*, якія не прэтэндуюць на ролю звышчалавекаў. Спустошаныя, без маральных прынцыпаў, яны вельмі патрэбны фашысцкай машыне ў якасці *«вінцікаў»*. Пісьменнік прапануе чытачу разабрацца ў расстаноўцы сіл сучаснага свету. У сваіх творах ён падкрэслівае думку, што ў заблытанай карціне ўзаемаадносін сёння важна не памыліцца, бо мяжа, якая раздзяляе свайго і чужога, не заўсёды супадае з дзяржаўнай мяжой (*«Жураўліны крык»*, *«Трэцяя ракета»*, *«Сотнікаў»*, *«Пайсці і не вярнуцца»*).

Апошнія апавяданні В. Быкава носяць прытчавы характар. У іх сутнасць звязкі *«выбар – свабода – адказнасць»* чалавека раскрываецца праз пачуццё віны за ўсё, што адбываецца вакол, а таксама за самога сябе. Чалавек павінен выбіраць, нават не маючы ніякіх знешніх падстаў для выбару. Чалавек сам надае каштоўнасць і сэнс свайму жыццю, бо яму дадзена свабода ад нараджэння, яна захоўвае яго чалавечае аблічча. Калі ж чалавек адмаўляецца ад свабоды, ён перастае быць чалавекам. У гэтым блізкасць да твораў французскіх экзістэнцыялістаў А. Камю і Ж.-П. Сартра. Чалавек жыве ў грамадстве, але яно нівеліруе чалавека, навязвае асобе трывіяльныя звычкі. Чалавек перажывае пачуццё страху і шукае прыстанішча ў грамадстве, растварaецца ў ім і губляе сваю індывідуальнасць. Ён суцешвае сябе тым, што ўсе смертныя. Смерць – вось мэта існавання. Але ці так гэта? Дарэчы, А. Камю і Ж.-П. Сартр разглядаюць смерць як ілжывую выснову з усведамлення абсурда. Абсурд – гэта яснасць, г. зн. яснае ўсведамленне чалавекам таго, што існаванне бессэнсоўна, і гэта асэнсаванне робіць чалавеку гонар [10, с. 65].

Герой (апавяданне В. Быкава *«Музыка»*) чуе гук, ці то звонку, ці то знутры, які нясе разлад, прадвызначае блізкую катастрофу. Можа, голас продкаў кліча музыку за сабой *«у зорную мітусню чорнага начнога неба?»*. Музыка губляе цялеснае адчуванне, вырываецца з трохмернай прасторы. Ён па-за часам. Ён глядзіць на зямлю з касмічнай цемрадзі і ўнізе бачыць таксама чарнату. Толькі *«да нясцерпнасці ўрачыста і кранальна»* гучыць гулрэквіем, плач па *«закінутым»* народзе, загадкавая сіла прывяла музыку на радзіму продкаў.

*« – Каго хаваеце? – хрыплавата крыкнуў у цемру... Толькі рэзанансное рэха голасу сціхла ўгары, як зноў жа з тае прасторы пачулася:*

*– Народ хаваем...»* [2, с. 40].

Раствараецца ў прасторы і музыка.

*«А пасля не засталося нічога»*.

Так, гэта будучыня вачыма пісьменніка... Аднак *«ці народ тыя дзесяць з нечым мільёнаў двуногіх істот, што топчуцца на гэтай зямлі сёння, не ведаючы, куды ісці: ці ў Еўропу, "дзе нас не чакаюць", ці на Усход, дзе мы бясследна растворымся ў бяскрайніх прасторах?»*. Зноў само жыццё нас ставіць у сітуацыю экзістэнцыяльнага выбару, калі ад яго залежыць далейшае існаванне нашай нацыі.

## Спіс літаратуры


1. *Бугаёў, Д.* Праўда і мужнасць таленту: выбранае: кніга пра В. Быкава. Артыкулы. Дыялогі / Д. Бугаёў. – Мінск, 1995. – 216 с.

2. *Быкаў, В.* Музыка / В. Быкаў // Нар. воля. – 1997. – 24 ліп.

3. *Кассирер, Э.* Опыт о человеке. Введение в философию человеческой культуры. Проблема человека в западной философии / Э. Кассирер. – М., 1988. – С. 7–8.

4. *Кон, И. С.* Открытие «Я» / И. С. Кон. – М., 1978. – С. 31.

5. Краткая философская энциклопедия. – М., 1994. – С. 416.

6. *Платон.* Сочинения: в 3 т. / Платон. – М., 1968–1972. – Т. 2. – С. 357.

7. *Соловьев, В. С.* Жизненная драма Платона / В. С. Соловьев // Философия искусства и литературная критика. – М., 1991. – С. 184.

8. *Томашев, В. В.* Человек в пространстве выбора: проблема ответственности в экзистенциальной антропологии США / В. В. Томашев. – Ярославль, 1998.

9. Человек: философ.-энцикл. словарь. – М., 2000. – 516 с.

10. *Яскевич, Я. С.* Социальная философия: антиномии человеческого бытия / Я. С. Яскевич. – Минск, 2005. – 420 с.


У трэцім нумары часопіса ў матэрыяле «Ёсць ідэя!» на с. 78 памылка: замест *В. Е. Лариса* неабходна чытаць *Л. В. Емельянчик*. Рэдакцыя «ВШ» просіць прабачэння за дапушчаную памылку.